


**М. БАНДАРЭНКА**
бібліятэкар аддзела маркетынгу,
сацыякультурнай дзейнасці
і метадычнай работы
Мазырскай цэнтральнай бібліятэкі
ім. А. С. Пушкіна

# Змаганне сіл дабра і зла праз прызму меладрамы

## Дыскусійны аналіз п'есы "Кім" Аляксея Дударава

***Мэты:*** звярнуць увагу на адметнасць меладрамы як сучаснага літаратурнага жанру; зацікавіць вучняў творамі драматурга, пісьменніка А. Дударава; паспрыяць вучнёўскаму разуменню права пісьменніка на сваю трактоўку і падачу падзей.

***Форма:*** літаратурны дыспут, дыскусія.

***Навучальны матэрыял:*** выстава кніг А. Дударава "Выпрабаванне на чалавечнасць", афішы спектакляў, партрэт аўтара.

***Удзельнікі:*** вучні 8 класа — пры вывучэнні п'есы "Кім"; вучні 8–11 класаў — пры правядзенні пазакласных мерапрыемстваў духоўна-выхаваўчай скіраванасці, прысвечаных тэмам Чарнобыля і яго наступстваў, сіроцтва і іншых.

***Запіс на дошцы:***

*Тэза першая:* меладрама — сацыяльны заказ сучаснага грамадства.

*Тэза другая:* меладрама — бязглуздзіца з мыльным прысмакам.

***Падрыхтоўка:*** клас падзяляецца на дзве групы: прыхільнікі тэзы першай і тэзы другой.

Пасля дыскусіі можна правесці літаратурны дыктант: удзельнікі вусна дапаўняюць інфармацыю вядучага, як таго вымагае яе пачатак.

### Ход занятка

#### I. Уступнае слова вядучага

Запрашаю ўсіх да абмеркавання твора, незвычайнага як па форме, так і па змесце. Гэта п'еса "Кім" Аляксея Дударава — пісьменніка, сцэнарыста, сапраўднага лідара беларускай драматургіі, аўтара звыш дваццаці папулярных п'ес.

У адным з інтэрв'ю А. Дудараў сказаў пра спектакль "Кім": "Калі я, аўтар, за месяц наперад не закажу білеты на спектакль, то мае сябры рызыкуюць не трапіць на яго ці будуць стаяць на адной назе".

Чаму менавіта гэты спектакль такі запатрабаваны ў гледача? Паспрабуем адказаць на гэтае пытанне напрыканцы сустрэчы.

П'еса "Кім" напісана на мяжы XX–XXI стагоддзяў і адлюстроўвае праблемы нашых дзён: лёс дзяцей-сірот у жорсткім грамадстве, бандытызм, наступствы чарнобыльскай трагедыі і змаганне з невылечнай хваробай, каханне, здольнае рабіць цуды.

Да якога жанру адносіцца п'еса? Чаму меладрама — жанр, які сёння пануе на тэлеэкранах, — карыстаецца такой папулярнасцю ў гледача?

#### II. Літаратурны дыспут

*Прыхільнік тэзы 2.* Меладраму справядліва называюць "мыладрамай", "мыльнай операй". Тэрмін "мыльная опера" нарадзіўся ў 1939 г. Галоўны рэдактар аднаго з англійскіх часопісаў Клейтан Морысан



Бандарэнка, М. Змаганне сіл дабра і зла праз прызму меладрамы : Дыскусійны аналіз п'есы «Кім» Аляксандра Дударава / М. Бандарэнка // Бібліятэка прапануе. - 2026. - № 1. - С. 5-9.

у сваім матэрыяле назваў дзённыя радыёмеладрамы "мыльнымі операмі", бо "заплакаць над такой лухтой і бязглуздзіцай можна толькі з дапамогай мыла".

Сёння асабліва запатрабаваныя кнігі-"аднаднеўкі". А ўжо тэлевізійная меладрама лезе ў ваш дом і вашу свядомасць "без мыла". Спажывец такой прадукцыі і сам не ведае, дзеля чаго экранныя героі на працягу паўгода, года, а то і больш круціліся перад ім, пamіралі, нараджаліся, разводзіліся, траплялі ў катастрофы і ў рэшце шлюбаваліся. Спажывец "мыла" прывыкае не ставіцца надта сур'ёзна да ўласнай біяграфіі. Шкодна тое ці карысна для яго душы і розуму?

*Прыхільнік тэзы 1.* Хочаце сказаць, што сучаснаму чытачу, і так апанаванаму рознымі фобіямі, на карысць сюжэты пра сацыяльныя выбухі, тэрарыстычныя атакі, тэхнагенныя і экалагічныя катастрофы? Пасля такіх твораў ён чакае, што і з ім вось-вось здарыцца штосьці жахлівае і непапраўнае. Сёння кніг, якія пацвярджаюць правамернасць такіх страхаў,— безліч. Разнастайныя формы гвалту, жыццё ва ўмовах зла і пакутаў — вось досвед сучаснай літаратуры. Няўжо гэта карысна для душы і розуму?

*Прыхільнік тэзы 1.* Не! Сучаснаму чалавеку патрэбны рэцэпт шчасця. Толькі не глупства якое-небудзь. Не граблі, на якія ўжо наступалі, не прапаганда асабістага поспеху і матэрыяльнага дабрабыту. Не сляпы падман: "Усё будзе добра", а нешта пераканальнае, здольнае аб'яднаць і скіраваць на стваральнае.

Мы чакаем такіх твораў, якія сфармулююць нейкі зразумелы адказ на павіслае пытанне "Што рабіць?" і пераканальна давядуць чытачу, што лепшай школай жыцця з'яўляецца шчасце.

*Прыхільнік тэзы 2.* Вось яно што... Адказ кшталту "Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго", амаль як у дудараўскім "Кіме"?.. Ці не занадта банальная ісціна і просты адказ?

*Прыхільнік тэзы 1.* Па-першае, ісціна праз сваю банальнасць не перастае ёю быць. Насамрэч, ісцін не так і многа, і ўсе яны — банальныя. Прастата ж адказу спрыяе разуменню. Сёння меладрама як ніякі іншы жанр спрыяе таму, каб зразумела сфармуляваны пісьменнікам адказ на пытанне "Што рабіць?" быў пачуты. Ніхто ж не стане спрачацца, што шчасця хочацца ўсім.

Меладрама ўжо таму з'яўляецца сацыяльным заказам, што яна адна сёння спатольвае эмацыянальны голад у сучаснага чытача. Чалавек шукае эмоцыю і знаходзіць яе там, дзе нават не спадзяваўся.

Мы супраць літаратурнай моды на адмову ад эмоцый, нежаданне мець справу з перажываннямі і суперажываннямі, а таксама з гневам і радасцю, страхам і смуткам.

*Прыхільнік тэзы 1.* Творца, які працуе ў жанры меладрамы, толькі даючы *свой* пераканальны адказ на пытанне "Што рабіць?", можа разлічваць быць пачутым. Проста кажучы, даючы адказ сродкамі таленавітай меладрамы.

**Вядучы.** Дыспутанты здолелі акрэсліць асноўныя крытэрыі меладрамы як жанру. Імі, а таксама азначэннем меладрамы, мы і выверым п'есу "Кім".

Давайце працягнем дыскусію з апорай на візітоўку твора ў выглядзе *кластара*. Схема можа быць падобная на гронку або планету са спадарожнікамі. У цэнтры схемы змяшчаецца тэма. Па баках — апорныя словы, якія паслядоўна раскрываюць тэму дыскусіі: праблематыка п'есы, яе парадаксальнасць, жанр, сюжэт, інтрыга, характэрныя рысы, канфлікт, характарыстыка персанажаў, збалансаванасць у п'есе дабра і зла.

*Падчас дыспуту вядучы мацуе на дошцы падрыхтаваныя апорныя словы або афармляе звесткі ў выглядзе запісаў.*

У чым, на ваш погляд, *парадаксальнасць сюжэта* п'есы? Якой праблеме яна прысвечана? *(П'еса прысвечана праблеме Чарнобыля і яго наступстваў.)*

Найперш драматург скарыстаў традыцыю сусветнай класікі адлюстроўваць трагедыю народа праз трагедыю нявінных ахвяр — дзяцей. Прыём бяспройгрышны, бо працінае жалем і спагадай нават каменныя сэрцы.

*Прыхільнік тэзы 1.* Трагедыяй у лёсе нашага народа быў і застаецца Чарнобыль з яго наступствамі. Парадаксальнасць п'есы "Кім" у тым, што пра трагічнае драматург расказаў жыццёсцвярджальна, аптымістычна — спалучыўшы, здавалася б, неспалучальнае. Пры гэтым не адсунуў саму трагедыю на задні план, але, вобразна кажучы, над авансцэнай усталяваў расцяжку: "Чым уратуемся?". Сёння сапраўды нашмат актуальнейшае пытанне "Што рабіць?", чым "Хто вінаваты?" Да ўсяго грамадству пагражае вынішчэннем яшчэ і духоўны чарнобыль. *(Звяртае ўвагу на плакат ці лозунг у радах сваіх прыхільнікаў "Душа ў агні!")*

*Падагульненне вядучага.* Драма адлюстроўвае жыццё праз дзеянне персанажаў. П'еса пішацца ў форме дыялогаў, характары ў ёй раскрываюцца ў непасрэдных сутыкненнях, без аўтарскіх ацэнак. Драме ўласцівы дынамізм дзеяння, напружаны сюжэт, пабудаваны на сутыкненнях паміж героямі. Паколькі п'еса пішацца для сцэнічнага ўвасаблення, яна мае абмежаваны аб'ём, невялікую колькасць дзеючых асоб і падзяляецца на акты, паміж якімі ў тэатры робіцца перапынак — антракт.

**Дакладчык.** П'еса "Кім" напісана ў 2000 годзе. Гэта тыповая *меладрама* — драматычны жанр, п'еса з вострай інтрыгай, рэзкім супрацьпастаўленнем Дабра і Зла, узмоцненай эмацыянальнасцю. Спачатку здаецца, што, як і ў любой меладраме, у цэнтры ўвагі — гісторыя кахання цяжкахворай Юлі і "высакароднага бандыта" Каралёва. Тыпова меладраматычнай з'яўляецца і сітуацыя, калі падлетак Кім, які падманам збірае грошы на лячэнне Юлі, сапраўды аказваецца сынам Каралёва.

Аднак у п'есе паказана не толькі каханне Юлі і Каралёва, якое ратуе душу ад чэрствасці, але і лёс дзяцей-сірот. Таму ў цэнтры ўвагі тут — трывога і адказнасць за блізкіх людзей, самаахвярнасць *(узаемаадносіны Кіма і Юлі, іх стаўленне да дзяцей)*.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Як расшыфроўваецца ў п'есе імя галоўнага героя? Якія жыццёвыя падзеі сфармулявалі характар падлетка? У якіх эпізодах п'есы ён паводзіць сябе як дзіця, у якіх — як дарослы?

*Падагульненне вядучага.* Вобраз Кіма — асноўны ў п'есе, нездарма твор мае такую назву. Асноўная ідэя вобраза — сцвярджэнне думкі аб тым, што чалавек з юнацкіх гадоў павінен несці адказнасць за блізкіх, быць чулым і моцным у любых жыццёвых абставінах, мець актыўную жыццёвую пазіцыю.

Вылучыце асноўную рысу характару Кіма, якая дазваляе лічыць яго сталым чалавекам. *(Уменне ўзяць на сябе адказнасць за блізкіх.)*

2. Асноўная праблематыка п'есы.

Твор мае не толькі сацыяльнае, але і філасофскае гучанне, якое надае п'есе ідэю ўсеперамożнай сілы дабра. *(Можна зачытаць урывак з тэксту ад слоў "Каралёў. Выходзь за мяне замуж" да слоў "Каралёў ахінае яе коўдрай, бярэ на рукі і выносіць з пакоя".)*

*Падагульненне.* Галоўнае для чалавека — "душою не ачарсцвець і не страціць святое штосьці", любіць людзей, дапамагаць таму, каму патрэбна дапамога, жыць па біблейскіх запаветах, асноўныя з якіх: любі блізкага як сябе самога, шануй бацькоў сваіх, не забі, не ўкрадзі.

3. Які сюжэт?

У аснову сюжэта пакладзена да банальнасці простая гісторыя. Такая гісторыя і такія абставіны, якімі выпрабоўваюцца многія сем'і, да якіх прыйшла бяда. Людзі адчайна шукаюць сродкі на лячэнне, спадзяючыся, што каштоўная аперацыя за мяжой выратуе іх блізкіх. Асабліва драматычна, калі ахвярамі Чарнобыля становяцца дзеці ці маладыя, якім бы жыць ды жыць. Такі сюжэт. Здавалася б, зусім бесперспектыўны, бо такіх, на вялікі жаль, мноства і ў рэальнасці. Пра іх штодзень паведамляюць нам праз СМІ.

Аднак менавіта інтрыга ды яшчэ ў спалучэнні з прыгодніцкімі і авантурнымі элементамі робіць банальны сюжэт не толькі цікавым, але і захапляльным.

*Прыхільнік тэзы 2.* З першых сцэн "Кіма" выклікаюць непаразуменне стасункі членаў дзіўнай сямейкі: чаму дарослыя цярпяць іранічную манеру адносінаў да сябе падлетка і нават дыктат і "дэмагогію"; чаму ва ўсіх дзяцей з дзіўнымі імёнамі-мянушкамі — розныя бацькі? Сірот апякае старэйшая сястра? Загадкі, загадкі... І дух перавесці аўтар не дае магчымасці.

*Прыхільнік тэзы 1.* Так, драматург з самага пачатку вырашае не паслабляць дынамікі сюжэта, а, наадварот, узмацняе яго элементам сапраўднага трылера. Але менавіта гэта і патрэбна — выклікаць трывогу, страх за лёс герояў. "Божа!" — ускліквае Юля, убачыўшы акрываўленага чалавека з пісталетам у руках. І толькі пасля сцэны выратавання героя чытач можа перавесці дух. Аднак расслабіцца і супакоіцца — не: наперадзе яшчэ шмат дзівоснага, загадкавага. І што яшчэ важней — пранізлівага і шчымлівага.

**Вядучы.** Ці не зніжае рэалізм твора спалучэнне інтрыгі з авантурнымі і прыгодніцкімі элементамі?

*Прыхільнік тэзы 2.* Сапраўды, напружанасць дзеяння, дынаміка, вастрыня і займальнасць сюжэта, эмацыянальнасць п'есы — усё гэта, безумоўна, уласціва п'есе "Кім".

А вось праўдападабенства відавочна нестае. Толькі наіўны чытач можа паверыць у паспяховасць такой "аперацыі", якую зрабіла Каралёву хворая Юля.

Вызывае скепсіс таксама і спосаб адшукання Кімам грошай на аперацыю для сястры. Ён і сам не верыць у іх выніковасці. Няўжо праблему ахвяраў Чарнобыля здольны вырашаць маральна ацалелыя багачы каралёвы і хадзеевы? Па сутнасці на Каралёве аказваецца завязана ўся інтрыга твора.

*Прыхільнік тэзы 1.* Пачнем з герояў, якім апаненты адмовілі ў праўдзівасці. Драматург з поспехам рэалізаваў галоўнае правіла — для дзяцей трэба пісаць гэтак жа, як і для дарослых, толькі яшчэ лепш.

Скептычнае стаўленне апанента да спосабу даставання Юляй атручанай кулі можна было б не абмяркоўваць увогуле. Бо сцэна патрабуе іншага бачання: яна — не пра Каралёва толькі, а пра ўсіх нас, і ў кантэксце твора мае сімвалічны сэнс.

Атрутнай куляй граху працятыя ўсе — святых сярод нас няма. Бязбожніку Каралёву быў пасланы выратавальны Цуд. Лічыў, што партманет засцярог ад вернай смерці,— аказалася, уратавала Евангелле: *"Паўгода таму, каб адчапіцца ад надакучлівых манашак, я купіў ім машыну цэглы, а яны мне падаравалі Новы Запавет... Твой* (Хадзеева) *абармот яго прастрэліў... Наскрозь"*. А. Дудараў якраз моцна клапоціцца аб праўдзівасці і вобразаў, і калізій.

*Прыхільнік тэзы 1.* Здавалася б, аднаго пасланага Цуду выратавання хапіла б хвораму чалавеку, каб паправіцца. Але драматург узмацняе праўдападобнасць, множыць дэталі, ствараючы інтрыгу. І ўсё так ці інакш працуе на звышзадачу твора — паказаць умовы духоўнага выздараўлення і ўзыходжання чалавека па *Лесвіцы Жыцця*.

Цуд, пасланы Богам, уратаваў плоць Каралёва, але не вылечыў яго душу ад атруты, якой ён наглытаўся за нялёгкае жыццё. Ачысціць сваю душу ад бруду можа толькі сам чалавек...

*Прыхільнік тэзы 2.* Пра тое і даводзілася: неправдападобна, каб такі, як Каралёў, апантаны помстай, у якога "ніколі не было ні маці, ні бацькі", які ў заклад аддаў нават падараваны яму Цуд, раптам захацеў вярнуць яго... Няўжо нешта можа ачысціць яго душу?

*Прыхільнік тэзы 1.* У такім выпадку варта звяр-

нуцца да асноўнага канфлікту п'есы — паміж закаханымі Юляй і Каралёвым. Свет Юлі — гэта клопаты пра прыёмных дзяцей, барацьба з хваробай, жаданне зрабіць свет лепшым. Свет Каралёва — гэта крымінальныя разборкі і мары з бутэлькай пра зорнае неба. Каханне вырашае гэты канфлікт, робіць лепшым Каралёва і дае шанц паправіцца Юлі.

**Пытанні для абмеркавання**

Ці можам мы сцвярджаць, што Юля шчыра пакахала Каралёва? Што змянілася ў жыцці Юлі з прыходам кахання? Які сэнс закладвае драматург у прозвішча Каралёва? *(Кароль — усемагутны ўладар жыцця.)* Як мяняе Каралёва каханне да Юлі?

**Падагульненне вядучага.** Узаемаадносіны Юлі і Каралёва — тыповая меладраматычная гісторыя пра тое, як каханне да высакароднай цяжкахворай дзяўчыны робіць лепшым бандыта і дае надзею на выратаванне. Гэтай гісторыяй аўтар сцвярджае каштоўнасць біблейскай ісціны аб тым, што людзі павінны любіць і падтрымліваць адно аднаго.

У п'есе ёсць і іншыя канфлікты — супрацьстаянне поглядаў Кіма і Каралёва, Каралёва і Хадзеева, дыялогі з якім маюць філасофскі змест, як і мастацкая дэталь — ад смерці Каралёва ратуе тое, што куля трапіла ў Біблію на грудзях.

Падняцца па Лесвіцы Жыцця складана, але не немагчыма. Спачатку Каралёву спатрэбілася адмовіцца ад помсты, прычым ад лютай — знішчыць дзіця свайго ворага. "Гэта кніжачка" і "прыдуркаватая мядзічка" дапамаглі хвораму Каралёву наблізіцца да Лесвіцы. Так, ён толькі наблізіўся да яе, не стаўшы нават на першую прыступку.

Сустрэча з Кімам, яго авантура, каб ўратаваць сястру ад смерці, даюць штуршок памяці Каралёва пра мінулае, пачаць шукаць ісціну.

*На дошцы вядучы малюе ці мацуе Лесвіцу Жыцця. У ходзе абмеркавання запісвае на прыступкі галоўныя тэзісы.*

**1.** Першай прыступкай на Лесвіцы Жыцця стала *прызнанне Каралёва ўласнай віны* ў сітуацыі барацьбы з Хадзеевым, адмаўленне ад бязгрэшнасці. І як вынік — бязлітасны *прысуд самому сабе*.

**2.** З гэтага і пачынаецца пагібель ранейшага Каралёва, здольнага адпомсціць, загубіць нявінную душу дзіцяці.

**3.** Прарыў, што адбыўся ў душы, настолькі ашаломіў Каралёва, што ён не паверыў яму больш, чым з'яўленню Кіма ў сваім жыцці. Але як вызначаецца *выздараўленне душы?* Сама таго не ўсведамляючы, Юля дапамагла знайсці адказ на важнае для Каралёва пытанне: "Вы ведаеце, калі чалавек пачынае выздараўліваць? З таго самага моманту, калі скажа сабе, што ён хворы".

Драматург моцна напалохаў чытачоў. Актуальныя праблемы, моцныя пачуцці выклікалі ў іх адпаведныя *эмоцыі і рэакцыю: суперажыванне, жаль,* спагаду, захапленне высакароднымі ўчынкамі герояў, урэшце, страх за іх, жаданне справядлівай іх узнагароды.

*Прыхільнік тэзы 1.* Спадзяванні гледачоў спраўдзяюцца. У фінале — поўная ідылія. Ва ўнісон меладраматычнаму фіналу гучыць апошняя шчымлівая рэмарка: "На гэтым мы з імі і развітаемся. Дай вам Бог шчасця!".

*Прыхільнік тэзы 2.* Вам? Чытачам і гледачам?

*Прыхільнік тэзы 1.* Так, драматург, адрасуючы нам свой твор, пра нас жа і распавядае. Гэта нам, каб быць шчаслівымі, каб перамагчы зло, варта найперш паклапаціцца пра стан уласнай душы, ачысціць яе ад бруду, перамагчы дробязнае, праз што мітусімся і не заўважаем цудоўнага і выратавальнага для сябе.

**Вядучы.** У чым, на ваш погляд, адметнасць дудараўскага адлюстравання жыцця праз барацьбу дабра са злом? Выкажыце сваё меркаванне пра збалансаванасць у п'есе дабра і зла.

*Прыхільнік тэзы 2.* Апаненты пераканалі нас у тым, што драматург клапоціцца аб праўдападобнасці, і канкрэтызавалі жанр п'есы як меладраму. Аднак мы не бачым важнейшы закон меладрамы, паводле якога жыццё адлюстроўваецца праз барацьбу дабра са злом *(зло заўсёды пакаранае, а дабро перамагае)*.

У творы відавочны дысбаланс сіл дабра і зла, а калі дакладней — лагер зла адсутнічае ўвогуле. Усе героі дзеяння — носьбіты дабра і яго ўвасабленне. Два дэманічныя персанажы, крыху паваяваўшы паміж сабой, зыначыліся ў анёлаў і далучыліся да згоднай кампаніі. Па сутнасці, сюжэт трымаецца толькі за інтрыгу, блытаніну і ўнутраны канфлікт.

*Прыхільнік тэзы 1.* Дудараў п'есай "Кім" узарваў жанр меладрамы, выключыўшы з твора дыдактычную накіраванасць, да якой скептычна ставяцца многія эстэты і знаўцы прыгожага. *(Праз тое гэты жанр і лічаць ніжэйшым за іншыя.)* Выключыўшы з п'есы маралізаванне і дыдактыку, драматург тым самым заклікае чытача і гледача не толькі глядзець, але і бачыць, не толькі слухаць, але і чуць. Прычым усё гэта з прымеркай на самога сябе: а што гэта п'еса, яе героі з іх лёсамі для мяне?

*Прыхільнік тэзы 1.* У п'есе ёсць лагер зла, ёсць баланс сіл дабра і зла, а галоўнае — ёсць процістаянне злу. Наступствы Чарнобыля ды яшчэ ў спалучэнні з сацыяльным сіроцтвам — гэта такая злыбяда для ўсіх нас, справіцца з якой можна толькі агульнымі намаганнямі, як змагаліся з ёю героі "Кіма".

*Прыхільнік тэзы 1.* Такім чынам, лёс герояў становіцца прыкладам для чытача, у ім гледачы шукаюць сэнс для сябе: кагосьці ўражвае гісторыя самаахвярнага кахання, здольнага лекаваць хворых, даставаць кулі з іх душы; некага ўражвае сіла сяброўства, якой можна разблытаць любыя вузлы, *у тым ліку і вузлы непаразуменняў;* іншых прымусіць задумацца барацьба паміж Каралёвым і Ха-

дзеевым, якія гатовыя былі згубіць і адзін аднаго, і ўласных дзяцей. Аднак нікога не пакіне абыякавым гісторыя падлетка, які адчайна шукае выйсця з тупіка і як толькі можа ратуецца сам і ратуе сваю сястру. Бо ратаваць іх няма каму. Маці загінула, бацька нават і не ведаў пра існаванне сына.

Хлопец разумее тое, што не разумеюць дарослыя: каб уратавацца самому, трэба дапамагаць і ратаваць бліжняга ("Калі яна памрэ, я згублю сям'ю"). Згубіць сям'ю — загінуць самому. Сёння грамадства страчвае свой галоўны падмурак — сям'ю:

*Разлад.*
*Развод.*
*Сіроцтва ўсё часцей.*
*І ходзяць беспрытульна па дарозе*
*Мільёны нашых страчаных дзяцей.*

П. Панчанка. "Ратуйце нашы душы"

*Прыхільнік тэзы 1.* З дзіцячай непасрэднасцю Кім прызнаецца, што толькі тупік змусіў яго пайсці на разыку: "А так я ніколі б да вас і не звярнуўся і не падышоў...". На пытанне Каралёва чаму, Кім адказаў: "Ваўкоў баюся".

Сёння дарослым нестае мудрага прагматызму Кіма і разумення таго, что сіроты пры жывых бацьках, як і дзеці недагледжаныя — дзеці "страчаныя", якія вырастуць і стануць "ваўкамі". Гісторыя Каралёва — яскравае таму пацвярджэнне. Тыя, каму некалі здрадзілі самыя родныя людзі, наўрад ці будуць літасцівымі да іншых. Праблема адрынутых дзяцей праз колькі гадоў вынікне праблемай, супастаўляльнай па сіле разбурэння з чарнобыльскай.

**Вядучы.** Пра такія беды ў народзе кажуць: усім мірам навaліцца — тым уратуемся. Чужой бяды не бывае, як не можа быць абыякавых да дзіцячай слязінкі, якой не варта шчасце ўсяго чалавецтва.

**Падагульненне**

Якіх бы вартых жалю гаротнікаў ні выводзіў у героях сваёй п'есы Дудараў, ён прытрымліваецца жыццёвага праўдападабенства ва ўсіх паводзінах і маўленні персанажа і — адначасова — надае ім эстэтычнай красы.

Чаму ж менавіта гэты спектакль такі запатрабаваны ў гледача?

Драматург стварае такія тэксты, што мы, чытачы, без рэмарак часцей за ўсё беспамылкова адчуваем эмацыянальны напал, якім поўніцца напісанае ў тэксце п'есы слова.

Драматург праз узаемаадносіны Юлі і Каралёва паказвае, што перад намі — тыповая меладраматычная гісторыя пра тое, як каханне да высакароднай цяжкахворай дзяўчыны робіць лепшым бандыта і дае надзею на выратаванне. Гэтай гісторыяй аўтар Аляксей Дудараў сцвярджае каштоўнасць біблейскай ісціны аб тым, што людзі павінны любіць і падтрымліваць адно аднаго.

Аляксей Дудараў аднойчы сказаў: "Разумней любові, шкадавання і слёз людзі нічога не прыдумалі... І ці прыдумаюць?".

Вось і ідэйны змест твора добра вызначыў сам А. Дудараў: "...у «Кіме» няма ні «слюняў», ні «сопляў» — ні ў п'есе, ні ў спектаклі. А ёсць заклік да ўсіх гледачоў: любіць адзін аднаго! Спадзяюся, мы цяпер ведаем, адкуль гэтыя словы".

На старонках гэтай п'есы вы не аднойчы з любасцю перачытаеце тыя мясціны, эпізоды, дыялогі, дзе драматург і напраўду па-мастацку ажыўляе слова ўжо ў яго кніжным выглядзе-гучанні. Дзівіць і радуе шырокі дыяпазон таго маўлення дудараўскіх персанажаў, якое мы, чытаючы тэкст, чуем, адчуваем, якое і самі быццам прамаўляем, паўтараючы наўздагон за героем.

Аляксея Дударава, на вялікі жаль, не стала 27 лютага 2023 г., але творы яго, як і памяць аб ім, будуць жыць вечна.

### III. Літаратурны дыктант і падвядзенне вынікаў.

**1.** Інтрыга ў п'есе "Кім" А. Дударава завязана на пошуках сіратой-падлеткам выйсця з тупіка... *(шукаючы сродкі на лячэнне сястры, ён знаходзіць бацьку).*

**2.** Невыпадковыя выпадковасці, збег абставін, непаразуменні, што ўзнікаюць паміж героямі, надаюць сюжэту п'есы "Кім"... *(дынаміку, вастрыню і займальнасць).*

**3.** Заблытвае дзеянне ў п'есе такое непаразуменне. Каралёў доўгі час не здагадваецца, што "прыдуркаватая медзічка, якая зубамі дастала атручаную кулю" з яго грудзей, і сястра Кіма — гэта... *(адна і тая асоба — яго каханая Юля).*

**4.** Ад смерці дачку Хадзеева ўратавала Юля, якая... *(дастаўшы кулю з грудзей Каралёва, "на каленях прасіла", каб не помсціў, бо яго "ўратаваў Сам Бог").*

**5.** Непаразуменні, праз якія Каралёў зняверыўся ў шчырасці пачуццяў Юлі, дапамагла разблытаць... *(сяброўка Юлі — Лена).*

**6.** Сваімі ўчынкамі героі "Кіма" ствараюць своеасаблівы ланцужок логікі і дабрыні. Сімвалічны сэнс такога ланцужка ў тым, што... *(ратуючы і дапамагаючы адно аднаму, кожны тым самым дапамагае і сабе, лекуе ўласную душу, ратуе ад бяды і сябе).*

**7.** У п'есе вялікую значнасць набывае трагізм узнятых праблем... *(пераадолення наступстваў Чарнобыльскай катастрофы і сацыяльнага сіроцтва).*

**Спіс літаратуры**

1. Дудараў, А. Ад меладрамы нікуды не схаваешся: інтэрв'ю з А. Ахметшыным / А. Дудараў // Мастацтва.— 2002.— № 7–8.— С. 12.

2. Дудараў, А. Крыж: зб. п'ес / Аляксей Дудараў; аўт. прадм. Б. Бур'ян.— Мн.: Беларусь, 2002.— 415 с.

3. Верціхоўская, М.І. Вывучэнне сучаснай беларускай драматургії. 11 кл.: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / М.І. Верціхоўская.— 2-е выд.— Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2015.— 168 с.

Мастацтва.— 2002.— № 7–8.— С. 12